# Невычэрпная КРЫНІЦА МУДРАСЦІ

## Фонды Нацыянальнай бібліятэкі "гавораць" на 54 мовах свету

Доступ праз Інтэрнэт да 107 электронных баз сацыягуманітарнага профілю розных арганізацый і ўстаноў свету маюць магчымасць атрымаць чытачы галоўнай бібліятэкі краіны. Паводле слоў намесніка яе дырэктара Людмілы Кірухінай, гэта аўтарытэтны рэсурс з інфармацыяй па дзяржаўным ладзе, эканоміцы, навуцы, інавацыйным развіцці, адукацыі. Наведвальнік можа папрацаваць, напрыклад, у бібліятэцы Кембрыджскага універсітэта або пабываць у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Створаны найбагацейшы электронны рэсурс: электронны каталог налічвае 1 мільён 600 тысяч запісаў. Пакуль ён выстаўлены толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы, але ў хуткім часе з'явіцца на інтэрнэт-партале НББ. Гэта дае магчымасць чытачам рабіць заказ на неабходны дакумент таксама і ў аддаленым рэжыме і, адпаведна, атрымліваць яго. Бібліятэка адкрыла сваю віртуальную чытальную залу ў шасці абласных бібліятэках краіны і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, прадаставіўшы доступ чытачам да тых баз дадзеных, якія мае.

Сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы звыш 8,5 мільёна адзінак захоўвання: розныя дакументы, кнігі, брашуры, перыядычныя выданні, ноты і г.д. Як дэпазітарый многіх міжнародных



арганізацый, а гэта ААН, ЮНЕСКА, АБСЕ, Сусветны банк і г.д., бібліятэка мае дакументы гэтых арганізацый, доступ да электронных рэсурсаў, якія яны ствараюць. Фонды "гавораць" на 54 мовах свету.

У перспектыве ўсе бібліятэкі краіны будуць мець базу аўтарытэтных запісаў, якая змяшчае імёны пісьменнікаў, навукоўцаў, укладальнікаў, усіх тых аўтараў, якія пражываюць у Беларусі і ствараюць інфармацыю. Такая база аўтарытэтных запісаў на рускай і беларускай мовах утрымлівае больш за 180 тысяч адзінак запісаў і будзе мець прадметныя рубрыкі. База будзе размешчана таксама і на партале НББ.

Электронная бібліятэка НББ налічвае каля 25 тысяч дакументаў. Яна яшчэ невялікая, уключае ў першую чаргу рэдкія выданні, дысертацыі, нацыянальную перыёдыку, кнігі, брашуры. Часткова гэтая база ўжо прадстаўлена для карыстання наведвальнікам. Аб магчымасці арганізацыі інтэрнэт-рэсурса гаварыць не прыходзіцца, паколькі неабходна

> Бібліятэчная сетка ў Беларусі налічвае амаль 10 тысяч бібліятэк, дзе працуе больш за дзевяць тысяч чалавек, 3,5 тысячы з іх маюць вышэйшую адукацыю. 84 працэнты беларускіх бібліятэк знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. Для абслугоўвання жыхароў глыбінкі ў Беларусі створана сістэма бібліёбусаў — сёння гэта 40 аўтамабіляў, якія дастаўляюць у малыя населеныя пункты ўсю неабходную літаратуру па папярэднім заказе.
>
> Чытацкія абанементы маюць 40 працэнтаў жыхароў Беларусі, а ўсяго за апошні год ім было выдадзена больш за 70 мільёнаў кніг.

захаванне аўтарскага і інтэлектуальнага права, а ў выпадку поўнага адкрыцця матэрыялаў такія правы будуць ушчэмлены.

Людміла Кірухіна адзначыла, што колькасць віртуальных наведванняў бібліятэкі за два гады з нечым з часу пераезду ў новы будынак склала 700 тысяч.

Жанна **Катлярова** ■